# Развіццё маўлення дзяцей ранняга ўзросту

Н.С. Старжынская

## Станаўленне маўлення на першым годзе жыцця

Ранняе дзяцінства з пункту гледжання развіцця маўлення падзяляецца на *два* перыяды:

- падрыхтоўчы перыяд (1 месяц — 1,5-2 гады);
- перыяд афармлення самастойнага маўлення (1,5-2 гады — 3 гады).

Першы год жыцця, які адносіцца да *падрыхтоўчага перыяду,* падзяляецца на *тры* этапы (Г. Л. Разенгардт-Пупко).

***Першы этап*** — этап эмацыянальных зносін дзіцяці з дарослым — ахоплівае час ад 1 да 5-6 месяцаў жыцця. *На першым месяцы* ў час кароткіх прамежкаў актыўнага няспання, на руках у дарослага, устанаўліваюцца першыя элементарныя зносіны дзіцяці з дарослым на *эмацыянальнай* аснове. Ініцыятыва зносін належыць даросламу. Вельмі важна выклікаць адваротную рэакцыю дзіцяці.

*На другім месяцы* значна павялічваецца трываласць актыўнага няспання. Гэта дазваляе мець зносіны з дзіцем не толькі непасрэдна на руках у дарослага, але і ў ложку, манежы. Зносіны дарослага з дзіцем у гэты перыяд набываюць характар «размоў»: дарослы гуляе з дзіцем, усміхаецца, стараючыся затрымаць на сабе дзіцячы позірк, выклікаць у яго ўсмешку. На другім месяцы жыцця дзіця пачынае праяўляць зрокавыя і слыхавыя адчуванні, доўга ўсміхаецца, калі з ім размаўляе дарослы, сочыць позіркам за цацкай. *На трэцім месяцы* дзіця адрознівае гукі рознай вышыни. Ініцыятыва зносін цяпер належыць самому дзіцяці: яно пачынае шукаць позіркам дарослага, убачыўшы яго, гучна смяецца, вымаўляе галосныя “*а-а”, “э-э-э”,* рухае ручкамі і ножкамі. Так узнікае “комплекс ажыўлення”.

*На чацвёртым месяцы* павялічваецца колькасць гукаў, якія вымаўляе дзіця, з’яўляюцца выгукі *“агу”, “гу-гу*” (гуканне), *«э», «і» і гук «р».* У другой палове чацвёртага месяца развіваецца гуленне, вымаўленне складаных комплексаў гукаў “*ціль*”, “*фррр...*”, *“а-э-э”, “р-р-р”.* Гукі вымаўляюцца пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кантролем слыху, дзеці пачынаюць прыслухоўвацца да сваіх вакалізацый. У канцы чацвёртага месяца жыцця дзіця само пачынае з дапамогай моўных гукаў выклікаць дарослага на ўзаемазносіны. Дзеці пачынаюць пераймаць і галасавыя рэакцыі іншых дзяцей.

У чатыры месяцы дзеці па гуку вызначаюць месца знаходжання прадмета, адшукваюць дарослага, пачуўшы яго голае і крыніцу гука, падаюць гучныя ґукі, падоўгу займаюцца з цацкамі (М. М. Шчалаванаў).

*На пятым месяцы* жыцця рухі і моўныя ґукі дзіця пачынае выкарыстоўваць як спосаб зносін з дарослым і іншымі дзецьмі: яно падпаўзае да свайго суседа, усміхаецца, вымаўляе асобныя гукі. Убачыўшы дарослага, дзіця выдае цэлы паток моўных гукаў, якія звернуты непаерэдна да яго, заклікае дарослага падысці, падоўгу напеўна гуліць, адрознівае тон, з якім да яго звяртаюцца.

У *канцы першага паўгоддзя* жыцця дзеці пачынаюць разумець сітуацыі ўкладвання спаць, догляду, міміку, жэсты. У *шэсць месяцаў* з'яуляецца лепятанне:шматразовае вымаўленне асобных складоў *(ба-ба, ма-ма-ма, ця-ця-ця* і шш.).

***Другі этап*** падрыхтоўчага перыяду (ад 6 да 11- 12 месяцаў) —узнікненне зносін дарослага з дзіцем на аснове разумения маўлення дарослага. Зносіны не абмяжоўваюцца толькі эмацыянальным кантактам, а вымагаюць выканання дзіцем пэўнага дзеяння.

Асноўнымі передумовамі разумення мовы дарослага і ўзнікнення ўласнага маўлення, паводле даных Д. Б. Эльконіна, з'яўляюцца: вылучэнне прадмета сярод іншых; засяроджанне увагі на прадмеце; наяўнасць у дзіцяці ярка выражанай эмацыянальнай рэакцыі.

Ф. І. Фрадкіна апісвае наступныя рэакцыі дзіцяці на звернутую да яго мову дарослага:

а) паварочванне да прадмета пасля яго называния дарослым (7—8 месяцаў);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) выкананне завучаных рухаў на словы «да пабачэння», «ладачкі» (7—8 месяцаў);

в) выкананне элементарных даручэнняу дарослых па слоўнай інструкцыі: «адчыні», «дай лялю», пакладзі» і іншых (9—10 месяцаў);

г) выбар прадмета па слоўным указанні (10-11 месяцаў);

д) прыпыненне дзеяння пад уплывам слоўнай забароны: «нельга» (12 месяцаў).

Як сведчаць даследаванні Ф. І. Фрадкінай і Г. М. Лямінай, дзеці ў 7—8 месяцаў рэагуюць спачатку на слова, як на пэўную суму гукаў, успрымаюць яго рытміка-меладычную структуру (тэмбр, тэмп, сіла гука, інтанацыя). І толькі з 10-11 месяцаў жыцця дзіця пачынае рэагаваць на змест слова. Пры гэтым слова для дзіцяці яшчэ не набыло абагульненага значэння, дзіця звязвае яго з канкрэтным (толькі адным) прадметам.

У другім паўгоддзі жыцця дзіця пераймае гукі ўласнага лепету, пазней лепет узбагачаецца новымі гукамі. Пераймаючы гукі дарослага, 10-11-месячнае дзіця засвойвае новую артыкуляцыю, паўтарае кожны пачуты гук або слова. Вымаўляе першыя словы-абазначэнні *(мама, тата, дай, на).*

*Трэці этап* падрыхтоўчага перыяду (10-12 месяцаў — другі год жыцця) — этап развіцця самастойнага маўлення дзіцяці.

У канцы першага года жыцця з'яўляюцца першыя ўсвядомленыя словы. Дзіця называв словамі дарослага *(мама, тата, цёця, няня, баба),* асобныя дзеянні *(«дай», «дзі-дiз”),* з'яуляюцца словы «*так*», «*не*». У слоўніку аднагадовага дзіцяці налічваецца ў сярэднім 8-12 слоў.

**Методыка развіцця разумення мовы дарослых і вымаўлення асэнсаваных слоў** у **дзяцей першага года жыцця**

Развіццё маўлення дзяцей па першым годзе жыцця ажыццяўляецца як на занятках, так і у штодзённым жыцці. Заняткі праводзяцца ў гульнявой форме індывідуальна з кожным дзіцем (з цягам часу для заняткаў аб'ядноўваюць 2-3, а ў канцы года – 5- 6 дзяцей) у спецыяльна адведзены для гэтага час (не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раней як праз і5 - 20 мінут пасля даглядання і не пазней як за 20 - 25 мінут да сну).

Работа праводзіцца ў некалькіх напрамках:

• Развіццё дамоўных праяўленняў і пераймання гукаў;

• Развіццё разумення маўлення;

• Навучанне вымаўленню першых асэнсаваных слоў.

**Развіццё дамоўных праяўленняу і пераймання гукаў**. Асаблівую ўвагу выхавацелю неабходна ўдзяляць развіццю галасавых рэакцый дзяцей, іх артыкуляцыйнага апарату. Дарослы максімальна выкарыстоўвае перыяд актыўнага няспання для індывдуальных размоў з дзіцем. У час заняткаў і даглядання за немаўляткам выхавальнік размаўляе з ім лагодным тонам, вымаўляючы асобныя гукі: *а-а-а, э-э-э, ках-ках-ках*. Дамагаецца, каб дзіця адказвала яму не толькі ўсмешкай, але і паўтарала гэтыя гукі. Пасля 3,5 месяцаў выклікае гуленне.

Развіццё слыху і галасавых рэакцый патрабуе спакойнай і ціхай абстаноўкі, каб дзеці без перашкод чулі маўленне дарослага, гуканні і гуленні іншых дзяцей, прыслухоўваліся да іх. У час размовы з дзецьмі карысна змяняць інтанацыю, перагукквацца (“*Тарасік, а-а-а-а”),* змяняць галасавыя рэакцы маўчаннем, каб спрыяць развіццю слыхавога засяроджання.

Выхавальнік паказвае дзецям цацкі, перастаўляючы іх з месца на месца, прыцягвае ўвагу дзяцей да гучальных прадметаў (бразготкі, гадзіннік, бубен, званочак). Трэба заахвочваць дзяцей да слухання музыкі і спеваў, паказваць пад музыку і песні дарослага яркія, бліскучыя прадметы[1]. Напрыклад, узяць дудачку або металафон, падысці да пярэдняга краю манежа і заіграць, потым адысці ў дррyгі бок, паўтарыць ігру і г. д. Дзеці кожны раз паварочваюць галовы ў бок крыніцы гуку. Рэкамендуецца напяваць песні без слоў (ля-ля-ля), размахваючы сцяжком (хустачкай), пастукваць ім па манежы, пакручвацца з ім.

[1] Фонарева С.Ф. Развитие и воспитание детей первого года жизни. М., 1972. С. 29-30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З трох месяцаў дзецям можна даваць гучальныя прадметы ў рукі Дзеці будуць прыслухоўвацца да гукаў, якія падаюць цацкі. Сістэматычныя заняткі прыводзяць да таго, што ў дзяцей да 5 месяцаў з'яўляецца «пявучае гуленне».

Пры фарміраванні пераймання, адзначае Г. М. Ляміна, спачатку трэба стымуляваць тыя гукі, якія былі ў гуленні: *а-а-а, э-э-э, кіх-кіх-кіх, агу, ціль* і інш. Выхавальнік можа мець зносіны адначасова з некалькімі дзецьмі, якія знаходзяцца ў манежы. Дзеці адказваюць на такую «размову» дарослага агульным ажыўленнем, спрабуюць вымавіць пачутыя гукі.

Дзеці 4-5 месяцаў самі пачынаюць «заігрываць» з дарослым шляхам гулення. Гуленне ў гэтым узросце ператвараецца ў самастойную дзейнасць. У выніку зносін дарослых з дзіцем, пастаяннага стымулявання гулення ў дзяцей 6-месячнага ўзросту ўзнікае лепет, што з'яўляецца важнай умовай далейшага развіцця самастойнага маўлення.

У другім паўгоддзі працягваецца работа над стымуляваннем пераймання гукаў і асобных складоў. Спачатку выклікаюць перайманне тых складоў, якія ёсць у лепятанні дзіцяці. Паступова дарослы ўводзіць новыя склады, выклікае іх перайманне.

Каб выклікаць перайманне, неабходна некалькі разоў паўтарыць склады, назваць імя дзіцяці, лагодна усміхнуцца. Важна, каб дзіця бачыла твар дарослага, яго артыкуляцыю. Пасля таго як дзіця навучыцца пераймаць новыя склады, можна арганізаваць гульні-перагукванні.

Асаблівую ўвагу на працягу першага года жыцця дзяцей трэба звяртаць на развіццё дробных мышцаў пальцаў рукі. Псіхафізіялагічныя даследаванні, праведзеныя М. М. Кальцовай, даказалі залежнасць развіцця актыўнага маўлення ад развіцця дробных мышцаў пальцаў: чым лепш развіты мышцы пальцаў, асабліва ўказальнага, тым хутчэй дзіця пачынае гаварыць. Таму неабходна рабіць лёгкі масаж кісці рукі, пальчыкаў дзіцяці, сгінаць і разгінаць іх, выкарыстоўваючы фальклорныя творы тыпу "Сарока-варона".

**Развіццё разумення маўлення.** З 5-6 месяцаў дзіця пачынае разумець маўленне дарослага, што патрабуе ўскладнення метадычнай работы па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

развіцці маўлення ў дзяцей. Праводзяцца для гэтага наступныя віды заняткаў: паказ і называнне прадмета і цацкі;  паказ і называнне рухаў і дзеянняў; гульні-хованкі; гульні-забавы.

Асноўным метадычным прыёмам у рабоце з дзецьмі гэтага ўзросту з'яуляецца *паказ* і *называние.* У аснове прыёму ляжыць супадзенне рэакцыі некалькіх аналізатараў (зрокавага, слыхавога, рухальнага), адначасовасць зрокавага ўспрымання прадмета з яго слоўным абазначэннем. У час паказу новага прадмета трэба пазбягаць лішніх слоў, каб не адцягваць увагі дзіцяці.

3 мэтай развіцця разумення маўлення выхавальнік як мага часцей паказвае і называе цікавыя для дзіцяці яркія рухомыя, гучальныя прадметы, дзеянні з імі, імёны акружаючых у той час, калі дзіця глядзіць на іх, разглядвае іх. Напрыклад, дзіця гуляе з машынкай. Дарослы гаворыць: *«Гэта машына, бі-бі, машына, машына едзе».* У час дагляданн я: *«Еш кашу, каша».*

'Грэба спецыяльна паказваць прадметы, называць іх[1]. На першых занятках паказваецца толькі адзін прадмет *(лялька, кошка, сабачка, пеўнік* і інш.), дарослы называе яго: *«Сабачка, сабачка аў-аў».* Пры гэтым слова важна ўключаць ў моўны кантэкст: шматразова, мяняючы інтанацыю, вымаўляць вывучаемае слова ў розных фразах («Вось мішка. Мішка сядзіць. Няма мішкі. На мішку. Вазьмі мішку» і г. д.). Называючы прадметы, трэба дамагацца, каб дзеці не толькі глядзелі на прадметы, а і выконвалі пэўныя дзеянні: узялі ў рукі, дакрануліся да іх, прыслухаліся да іх гучання. 3 мэтай замацавання слова-назвы дарослы звяртаецца да дзіцяці з пытаннем: «Дзе ляля?» Гэта выклікае ў дзіцяці зрокавую рэакцыю, стымулюе яго да пошуку прадмета.

Выбраныя для паказу цацкі размяшчаюцца ў розных канцах пакоя (на шафе, на паліцы, на стале), каб дзеці іх добра бачылі з манежа. Дарослы падносіць дзіця да цацкі і гаворыць: «Кіса, мяў-мяў. Вось кіса». Адыходзіць убок і пытаецца: «Дзе кіса, мяў-мяў?» Дае цацку дзіцяці і зноў называе «кіса», «мяў-мяў». Пры паўторным паказе прадмета можна адразу спытаць у дзіцяці: «Дзе кіса, мяў-мяў? Вось кіса!».

[1] Петрова В.А. Занятия по развитию речи детей до трех лет М., 1970. С. 6

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

К 7 месяцам дзіця на пытанне «дзе?» шукае прадмет і спыняе позірк на гэтым прадмеце, які знаходзіцца заўсёды ў пэўным месцы, а ў канцы 8-га месяца — адшукваць знаёмы прадмет, дзе б ён ні быў. Калі дзіця навучыцца выконваць такое заданне, змест гульняў-заняткаў ускладняецца: павялічваецца колькасць прадметаў, прызначаных для паказу на адных занятках (напрыклад, лялька і коцік; лялька, коцік і зайчык). К 9 месяцам дзеці здольны на пытанне «дзе?» адшукаць некалькі знаёмых прадметаў, якія знаходзяцца ў розных месцах пакоя.

Вялікае значэнне маюць гульні-хованкі, сэнс якіх - развіццё ў дашкольнікаў разумення імёнаў дарослых і дзяцей. Выхавальнік хаваецца пад хустку або за манеж і кліча: «Ку-ку, цёця Воля!» Пасля дарослы закрывае хусткай адно дзіця і пытаецца: «Дзе Віця?», «Няма Віці», адкрывае хустку: “Вось Віця».

У другім паўгоддзі праводзіцца і такі від заняткаў, як паказ і называние дзеянняў: «Да пабачэння», «Ладачкі», «Сарока-белабока». Выхавальнік падыходзіць да дзіцяці, паказвае, напрыклад, «ладачкі», называе імя дзіцяці: «Яначка, ладачкі-ладачкі», бярэ ручкі дзіцяці ў свае і пачынае пляскаць імі ў далоні. У працэсе заняткаў неабходна навучыць дзяцей разумець слова «дай» («дай лялю», «дай шарык») і іншыя словы, што азначаюць дзеянні: «знімі», «вазьмі», «пакаці».

Ва узросце ад 9-10 месяцаў да аднаго года гульні-заняткі па развіцці маўлення паступова ўскладняюцца. Акрамя індывідуальных заняткаў праводзяцца і групавыя (5—6 дзяцей)[1]. Выхавальнік паказвае, напрыклад, коника на колах, паварочвае яго, каб дзеці добра разгледзелі Пры гэтым паўтарае з паўзамі «Гэта конік... конік... конік». Перасоўвае цацку па манежы, прагаворваючы: «Бяжыць конік: цок-цок-цок! Тпру, конік! Тпру, конік! Стой! Стой! Зноў паскакаў. Стой! Стой жа! Тпру!» Дае дзецям дакрануцца да коніка.

[1] Дидактические игры и занятия с детьми раннего возраста / Под ред. С.Л.Новоселовой. М., 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры паўторным паказе выхавальнік, прагаворваючы: “Ідзі, конік, дамоў, Тпру ... ідзі”, хаваю цацку ў хатцы-скрынцы, разводзіць рукамі «Няма коніка». Затым зноў выводзіць коніка: «Вось конік! Конік будзе бегчы... тпру... стой!» Накрывае цацку сурвэткай: «Няма коніка». Пытаецца: «Дзе конік?», запрашае дзіця зняць сурвэтку: «А вось конік!»

На адных занятках можна паказваць некалькі прадметаў (лялька, машына, мячык). Пажадана аб'ядноўваць іх нескладаным сюжэтам. Працягваецца развіццё разумення назваў новых дзеянняў з прадметамі: «зачыні», «адчыні», «вазьмі», «кладзі», «сядай», «прынясі» і інш.

У другім паўгоддзі неабходна заахвочваць дзяцей да дзеянняў з прадметамі. Дарослы паказвае цацку, называе яе, выконвае з цацкай розныя дзеянні, абазначаючы іх словам!: “Ляля топ-топ-топ”, прапануе дзіцяці зрабіць гэтак жа.

З дзецьмі 10 месяцаў з мэтай развіцця абагульненняў праводзяцца гульні-заняткі, у працэсе якіх паказваюць некалькі прадметаў адной назвы, але розных па памеры, зробленых з рознага матэрыялу (напрыклад, лялькі вялікая і маленькая, гумавая і пластмасавая). «Дай лялю, - просіць выхавальнік.— Дзе ляля? Дай лялю». Далей яна вучыць знаходзіць знаёмую цацку сярод іншых.

З малымі канца першага года жыцця праводзяцца даступныя ім гульні-заняткі з лялькай, напрыклад, «Лялька прыйшла у госці да дзяцей». Малыя вучацца адказваць на пытанне «дзе?», адшукваць ляльку, часткі яе цела, твару: паказваць вочы, нос у лялькі і ў сябе[1].

**Навучанне вымаўленню першых асэнсаваных слоў**. Па даных даследаванняў М. М. Кальцовай, Н. М. Аксарынай, у канцы першага года жыцця слова дарослага становіцца для дзіцяці абазначэннем пэўных прадметаў, дзеянняў. Гэта дае магчымасць навучыць дзяцей вымаўленню першых усвядомленых слоў.

---

[1] Дидактические игры и занятия с детьми раннего возраста / Под ред. С.Л.Новоселовой. М., 1985. С. 37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Навучанне вымаўленню першых слоў адбываецца паэтапна: спачатку дзіця разумее слова, затым паўтарае яго за дарослым і, у рэшце рэшт, самастойна выкарыстоўвае слова ва усвядомленай сітуацыі.

Прыёмы навучання дзяцей вымаўленню першых усвядомленых слоў апісаны Г. М. Лямінай[1]. Да іх адносяцца перш за усё слоўнае абазначэнне дарослым прадметаў і цацак, якія выклікаюць цікавасць у дзіцяці, заахвочванне дзяцей да вымаўлення слова. («Скажы: пеўнік, ку-ка-рэ-ку».)

Калі слова складанае для дзіцяці па свайму г-кавому складу, можна прымяніць такі педагагічны прыём, як называние дарослым разам з поўнай назвай прадмета спрошчанага вымаўлення слова *(машына — бі-бі, сабака — гаў-гаў, гадзіннік — цік-цік),* Гэта дазваляе актывізаваць маўленчую дзейнасць дзяцей і паступова падводзіць іх да правільнага вымаўлення слова. Эфектыуным прыёмам навучання дзяцей вымаўленню першых слоў з'яўляецца шматразовае паўтарэнне дарослым гэтага слова.

Дзеці прывыклі выяўляць свае жаданні і просьбы жэстамі, мімікай. У 10—12 месяцаў неабходна вуічыць дзіця выказваць свае жаданні словамі: «Скажы: дай, цёця, мячык».

Праводзяць з дзецьмі гэтага ўзросту і спецыяльныя заняткі, якія заахвочваюць малых да вымаўлення першых слоў: паказ і называние дзецьмі цацак і прадметаў, хаванне прадмета і яго паказ, заняткі з малюнкамі.

У канцы года (10—12 месяцаў) можна праводзіць *гулъні-заняткі з цацкамі-жывёламі.* Выхавальнік расказвае дзецям кароткае сюжэтнае апавяданне з гукапераймальнымі словамі, дамагаецца ад іх называння цацкі поўным словам або гукапераймальным. Дзецям 11-12 месяцаў можна чытаць кароткія пацешкі («Тупу-тупу ножкамі...»), суправаджаючы іх дзеяннямі.

*Заняткі з малюнкамі* праводзяцца з дзецьмі 10-12 месяцаў, калі яны дасягнулі адпаведнага ўзроўню маўленчага развіцця, навучыліся адрозніваць дарослых па імёнах, а цацкі-жывёлы — па назвах, вымаўляць першыя ўсвядомленыя словы. Спачатку заняткі праводзяцца індывідуальна,

[1] Лямина Г.М. Развитие речи у детей в раннем возрасте. М., 1964.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паступова колькасць дзяцей можна давесці да 2—3. Заняткі з малюнкамі на першым годзе жыцця праводзяцца 3—4 разы на тыдзень, працягласць іх — 3-5 мінут.

Паказ трэба пачынаць з прадметнага малюнка, каб прадмет быў дзіцяці добра знаёмы. Памер малюнка — 8х20 см. Выхавальнік паказвае малюнак, называе прадмет: «Гэта кіса, паглядзі, кіса...» Калі дзіця разгледзіць малюнак, яго раптоўна хаваюць: «Няма кісы. Дзе кіса?», стымулюючы гэтым пошук малюнка. Потым зноў паказваюць малюнак: «Вось кіса, кіса... Волечка, дзе кіса? Пакажы». Можна паказаць рукой дзіцяці. Паказ і хаванне малюнка паўтараюць 2-3 разы. Заканчваюцца заняткі хаваннем малюнка.

З адным малюнкам можна правесці 3—6 заняткаў. Выхавальнік дамагаецца пазнавання дзіцем адлюстраванага на малюнку прадмета, вучыць паказваць яго на слова «дзе?», падаваць малюнак на слова «дай», выклікае перайманне слоў: *аў-аў, ту-ту.*

З цягам часу на занятках паказваюцца два малюнкі. Заняткі пачынаюцца з паказу і хавання добра знаёмага дзіцяці малюнка. Потым паказваюць новы малюнак, кладуць яго побач са знаёмым, прапануюць паказаць па чарзе то адну, то другую карцінку: «Дзе кіса? Дзе ляля?» Па чарзе хаваюць і паказваюць малюнкі, просяць паўтарыць слова: «Скажы: кіса, кіс-кіс".

Паступова колькасць малюнкаў на адных занятках павялічваецца да 8—10. Акрамя паказу і називания малюнкаў, выхавальнік вучыць дзяцей выконваць дзеянні з малюнкамі «дай», «вазьмі». Можна класці 3-4 малюнкі ўніз выявай і прапанаваць дзіцяці знайсці адпаведны малюнак: «Знайдзі лялю», «Знайдзі машыну», дамагаючыся ад дзяцей пераймання лёгкіх слоў.

Важнае значэнне для развіцця маўулення дзяцей мае работа ў штодзённым жыцці. Пры выкананні розных рэжымных працэсаў і гігіенічных працэдур трэба гаварыць з дзецьмі аб прадметах, рухах, дзеяннях, звязаных з гэтымі працэсамі (кармленнем, укладваннем спаць, адзяваннем і г. д.). Напрыклад, у час кармлення паказаць ежу, выклікаць станоўчую рэакцыю і галасавыя праяўленні, спытаць: «Таццянка хоча есці, ам-ам?» Паўтарыць пытанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

некальш разоў, дамагацца пераймання простых слоў (ам-ам). Працэс зносін суправаджаецца размовай выхавальніцы з дзіцем: «Адкрый роцік», «Вазьмі лыжачку», «Еш», «Пі» і інш.

Дзеці пачынаюць хутка разумець звароты і патрабаванні дарослага і выконваць адпаведныя дзеянні. У канцы першага года жыцця дзіця можа па ўласнай ініцыятыве, пабачыўшы, напрыклад, ежу, прасіць яе ў дарослага («ам-ам»), або адмаўляцца ад яе («не-не»). Дарослы паўтарае некалькі разоў: «Іра хоча кашу», «Скажы: дай-дай, цёця, кашу!», «Іра, на кашу».

**Асаблівасці развіцця маўлення дзяцей другога года жыцця**

Другі год жыцця з'яўляецца перыядам хуткага развіцця маўлення дзяцей. Умоўна яго можна падзяліць на два этапы:

першы — ад 1 года да 1 года 5—6 месяцаў;

другі — ад 1 года 5—6 месяцаў да 2 гадоў.

На першым этапе працягваецца развіццё разумення маўлення дарослага, засваенне гукапераймання, першых слоў, на другім — павялічваецца слоўнік і развіваецца актыўнае маўленне.

**Разуменне маўлення дарослых**. На пачатку другога года жыцця дзіця пачынае хутка ўстанаўліваць сувязь паміж словам і прадметам, словам і дзеяннем («дай руку», «вазьмі сцяжок», «сядзь», «устань»), разумее пытанне «дзе?», правільна рэагуе на яго. Спачатку разуменне залежыць ад канкрэтнай сітуацыі, у якой адбываюцца зносіны, пазней дзіця пачынае выходзіць за межы канкрэтнай сітуацыі.

У 1 год 3—4 месяцы дзеці ўжо могуць разумець некаторыя тлумачэнні дарослага, напрыклад як нанізваць кольцы пірамідкі на палачку. Яны здольны выконваць нескладаныя даручэнні дарослага: «Вазьмі у Вовы мячык», «Дай лялю Машы» і г. д. Паступова дзеці пачынаюць разумець фразы, пытальныя звароты: «Хто разліў ваду?», «Хто пашыў лялі сукенку?» У другой палове другога года жыцця малы разумее кароткія расказы, праяўляе павышаную цікавасць да размовы дарослых, удзельнічае ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкананні асобных дзеянняў, якія ўзгадваюцца уўразмове, да дзіцяці непасрэдна не звернутай.

Ужо у першай палове другога года жыцця ў дзіцяці развіваецца здольнасць да абагульнення — вельмі важная якасць, якая садзейнічае актывізацыі мысліцельнай дзейнасці і фарміраванню актыўнага маўлення. Малы, напрыклад, называе сабачкам не тольш цацку, а і намаляванага сабачку, і жывога. У канцы другога года жыцця дзіця пазнае прадметы незалежна ад іх колеру, формы, велічыні. У гэтым узросце яно пачынае разумець сувязі паміж прадметамі: ваду можна наліць у шклянку, пераносіць у вядзерцы; каб што-небудзь намаляваць, трэба ўзяць аловак і паперу. Дзіця ўжо разумее па апісанні мінулыя падзеі, напрыклад: «На прагулцы дзеці бачылі машыну, бі-бі». Маўленне дарослага для дзіцяці становіцца асноўным рэгулятарам яго паводзін.

**Развіццё актыўнага маўлення**. У першыя 2—3 месяцы другога года жыцця захоўваюцца асаблівасці псіхічнага развіцця, характэрныя для папярэдняга узроставага этапа. Дзеці многа ляпечуць, у лепеце з'яўляюцца новыя гукі і гукаспалучэнні Яны радасна пераймаюць гукі, няцяжкія словы. У іх актыўным слоўніку налічваецца 10-15 слоў («мама», «дай», «баба» і г. д.). Звяртаюцца з просьбамі, скаргамі, паказваючы жэстамі, мімікай, часам дадаючы знаёмыя словы.

Тэмпы засваення новых слоў на другім годзе жыцця даволі нераўнамерныя. Значна павольней пашыраецца слоўнік дзяцей у першай палове года. Дзіця чуе назвы прадметаў, характарыстыку іх уласцівасцей, што адносяцца да колеру, формы, велічыні, размяшчэнню частак, дзеянняў з імі, а таксама вынікаў апошніх і многае іншае. Аднак гэтае багацце інфармацыі перавесці ў актыўны слоўнік пакуль не ўдаецца: 5 1,5 гадам актыўны слоўнік складае ўсяго 30-40- слоў.Сярод іх многа слоў-складоў, аблегчаных слоў, ташх як «ляля», «ко-ко», «бі-бі». Слоўнік дзіцяці ў паўтара года складаецца ў асноўным з назоўнікаў і дзеясловаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паміж словамі дарослых і дзяцей існуюць розныя фанетычныя адрозненні. Па даных Т.Я. Коннікавай, гэтыя адрозненні могуць быць наступнымі: а) дзіцячыя словы зусім не падобныя на словы дарослых *(адзіга* — рыбін тлушч); б) дзіцячыя словы ўяўляюць сабой урыўкі слоў дарослых *(па* — упала, *мако* — малако); в) дзіцячыя словы захоўваюць агульную фанетычную падобнасць са словамі дарослых *(ноня* - ножка), словы-гукаперайманні *(кіс-кіс, ту-ту).*

Першыя словы дзіцяці адрозніваюцца шматзначнасцю, слова адносіцца да некалькіх прадметаў, аб'ядноўвацца: а) па функцыянальных прыкметах *(фу* — запалкі, цыгарэта, лямпа); б) па месцы знаходжання *(апу* — нож, хлеб, талерка, сальніца); в) па знешнім падабенстве *(кх* — кошка, шапка, каўнер; *гага* — жоўтая качка, жоўтае лісяня, жоўтая навёрка); г) па гукаперайманнях *(бі-бі* — машынка, трамвай, тралейбус).

Самастойнае маўленне дзяцей да паўтара года з'яўляецца падрыхтоўчым, паколькі яно яшчэ не выкарыстоўваецца дзіцем як актыўны спосаб маўленчых зносін.

У другім паўгоддзі слоўнік дзіцяці узбагачаецца хуткімі тэмпамі Калі ў дзяцей у 1 год 6 месяцаў налічваецца да 40 слоў, то у і год 8 месяцаў— 100, у 1 год 9 месяцаў — 175, у 2 гады — 300 - 400 слоў (Г. Л. Разенгардт-Пупко, Л.Н. Паўлава). Дзіця пачынае выкарыстоўваць розныя часціны мовы.

Першыя словы дзяцей адрозніваюцца невыразнасцю іх вымаўлення,. Дзіця можа вымаўляць адно і тое ж слова па-рознаму: *мя-я, мяс, мяік* (мяч, мячык). Для дзяцей гэтага ўзросту характэрна агульнае змякчэнне гукаў, пропуск гукаў і складоў, замена адных гукаў іншымі. Вымаўленне галосных даецца дзецям лягчэй, чым зычных. Дзецям другога года жыцця больш легка даецца вымаўленне губных (*б, п, м)* і выбухных (*г, к, т, д)* зычных гукаў. Большасць дзяцей правільна вымаўляе гукі *в, н, ль.* Правільнае вымаўленне гукаў *з, с, ж, ш, ч, ц, х, ф* затрымліваецца, дзеці або зусім не вымаўляюць іх, або замяняюць іншымі (Г. М. Ляміна).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На другім годзе жыцця развіваецца фанематычны слых малога. Па даных Н. Х. Швачкіна, дзіця ужо ў канцы першага года жыцця адрознівае га-лосныя і зычныя гукі, розныя групы зычных (санорныя, цвёрдыя, мякйя і інш.), розныя па гукавым складзе словы: «акно», «ляля», але блытаюць блізкія па гучанні: «суп», «зуб».

На першых этапах дзіця адрознівае далёкія фанемы [д] і [к], [а] і [ж] і не дыферэнцыруе блізкія [д] і [т], [г] і [х], [з] і [с], [б] і [п]. Сярод галосных дзіцяці цяжка адрозніць *а* і *у*. Сустракаецца і такая з'ява, калі дзіця само вымаўляе гук няправільна, але чуе яго правільна, заўважае няправільнае вымаўленне іншых людзей. К 1 году 7 месяцам фанематычны слых

Значным дасягненнем у развіцці маўлення дзяцей другога года жыцця можна назваць першапачатковае авалоданне граматыкай. У маўленні дзіцяці з'яуляюцца аднаслоўныя, а пазней двух- і трохслоўныя сказы. Спачатку дзіця злучае словы ў сказы, не спалучаючы іх («Дай бу-ля» — дай булку). У канцы другога года жыцця малы пачынае правільна ужываць адзіночны і множны лік назоўнікаў, засвойвае некаторыя памяншальныя суфіксы, назоўны, родны, вінавальны склоны, авалодвае сказамі рознай інтанацыі. Мова становціца сродкам зносін не толькі з дарослымі, але і з дзецьмі.

### 2.4. Методыка развіцця маўлення дзяцей другога года жыцця

Работа па развіцці маўлення дзяцей другога года жыцця адбываецца як у штодзённым жыцці, так і на спецыяльных занятках. Вельмі важна развіваць адначасова у дзяцей разуменне мовы дарослых і актыўнае маўленне

Гадаванне дзіцяці заўсёды суправаджаецца словам. Так, у час кармлення дарослы вядзе размову: «Волечка хоча малака? Вось малачко, пі... Смачнае малачко. Што ты п'еш, Воля?.. Выпіла Волечка малачко? Скажы: дзякую”. У працэсе адзявання дзіцяці неабходна называць часткі цела, прадметы адзення, у час мыцця — часткі твару, заахвочваючы дзіця да паўтарэння.

Арганізаваныя заняткі па развіцці маўлення і пашырэнні арыентыроўкі ў наваколлі з дзецьмі ад 1 года 5—6 месяцаў праводзяцца штодзённа (5 разоў на тыдзень) з невялікімі ґрупамі дзяцей (5—6 чалавек). Гэта заняткі чатырох

відаў: **назіранні** рэальных аб'ектаў і прадметаў бліжэйшага акружэння (жывых і нежывых аб'ектаў); **інсцэніраванне** з дапамогай цацак рэальных і казачных сітуацый; **разглядванне** адлюстраванняў знаёмых прадметаў на малюнках (пазнаванне, называнне, складанне расказаў); **чытанне** мастацкай літаратуры (расказаў, казак і г.д.)., Заняткі, прадстаўленыя ва ўказанай паслядоўнасці, адлюстроўваюць розныя ўзроўні адцягненасці мыслення, якімі дзіця паступова авалодвае на другім годзе жыцця.[1] Працягласць заняткаў — 8-9 мінут. У першым паўгоддзі акрамя групавых праводзяцца і індывідуальныя заняткі.

З дзецьмі ад 1 года 6 месяцаў да 2 гадоў праводзяцца прыкладна 4 заняткі ў тыдзень з групамі 6—10 чалавек (працягласць заняткаў —10—15 мінут). Гэта тыя ж заняткі, што і ў малодшай падгрупе, але іх змест і мэта ўскладняюцца. Дзеці адшукваюць прадметы, цацкі, схаваныя выхавальнікам, з імі праводзяцца размовы аб тым, што ім ужо вядома, напрыклад, што дзеці рабілі, што бачылі на прагулцы.

**Паказы прадметаў і дзеянняў з называнием.** Гэтыя заняткі спрыяюць развіцію разумения маўлення дарослых, узбагачэнню пасіўнага і актыўнага слоўніка, пашырэнню ўяўленняў аб наваколлі Для заняткаў, акрамя прадметаў хатняга абіходу, жывых і нежывых аб'ектаў, цацак, малюнкаў, кніг, патрэбен і спецыяльны матэрыял. Гэта, перш за ўсё, дыдактычная лялька, упершыню прапанаваная Л. І. Ціхеевай. Лепш мець дзве лялькі сярэдняга памеру. Адна лялька мяккая, другая — цэлулоідная, абедзьве з поўным камплектам адзення і бялізны. Для паказу сюжэтаў і дзеянняў з лялькай неабходна мець наборы мэблі, пасцельных рэчаў, посуду, прыладу для купания лялькі

З дзецьмі ад 1 года да 1 года 3 месяцаў праводзіцца паказ прадмета з называнием яго. Асноўны метадычны прыём — нечаканае хаванне і паказ прадметаў. Выхавальнік паказвае цацку: «Да нас прыйшоў сабачка. Гаў-гаў, сабачка... Паглядзіце на сабачку»,— гладзіць рукой цацку, прапануе дзецям

---

[1] Павлова Л.Н. Раннее детство: развитие речи и мышления. М., 2000. С. 31

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пагладзіць сабачку. Затым нечакана хавае цацку: «Дзе сабачка? Няма сабачкі, схаваўся сабачка. Дзе, дзе сабачка?» Паказвае сабачку, дае дзецям магчымасць выказаць радасць, прапануе вымавіць гукаперайманні «гаў-гаў», словы: «вось сабачка, гаў-гаў».

Паступова колькасць цацак павялічваецца да 2—3, пазней — да 10. Яны паказюцца на адных занятках, лепш за усё зрабіць гэта праз дыдактычную гульню «Чароўны мяшочак».. У прыгожы яркі мяшочак падбіраюцца знаёмыя дзецям цацкі, але не тыя, з якімі яны гуляюць штодзённа. На першых занятках лепш падбіраць непадобныя паміж сабой цацкі, напрыклад, сабачка, машына, пеўнік. Выхавальнік дастае цацкі з мяшочка, называе іх: «Вось машына, а гэта пеўнік, ку-ка-рэ-ку, гэта сабачка, гаў-гаў.». Ставіць цацкі на стол, прапануе дзіцяці паказаць патрэбную цацку: «Ірынка, вазьмі машыну,бі-бі. Скажы: машына, бі-бі. Дай мне машыну... Юрасік, схавай машыну ў мяшочак. Дзе машына? Няма машыны. У мяшочку машына».

З мэтай практыкавання дзяцей у называнні прадметаў праводзяцца заняткі «Выстаўка цацак», На паліцы выстаўляюцца знаёмыя цацкі. Выхавальнік падыходзіць з дзецьмі да паліцы. Тыя разглядваюць цацкі, называюць іх, паўтараюць за дарослым: «Гэта машына, бі-бі», «Гэта кіска, мяў-мяў” Выхавальнік можа прапанаваць дзіцяці падаць ёй цацку: «Ліда, вазьмі з палічкі пеўніка і дай мне. Што ты падала? Як пеўнік крычыць?»

Тая ж мэта прадугледжваецца ў гульні «Прынясі і назаві». Выхавальнік раскладвае ў розных месцах пакоя цацкі, але так, каб дзеці іх бачылі. Цацак павінна быць больш, чым дзяцей. Малым прапанусцца знайсці цацку. Калі хто з іх прыносіць цацку , выхавальнік пытаецца: «Што ты прынёс?», размаўляе з дзіцем пра цацку.

З 1 года 3 месяцаў да 1 года 6 месяцаў дзецям Паказваюцца цацкі і іх дзеянні: «Машына едзе, бі-бі, прыехала... стала машына», «Зайка сядзіць, скача зайка— скок, скок... упаў зайка».

У другой палове другога года жыцця малым паказваюцца дзеянні, звязаныя ў сюжэт. Напрыклад: «Ідзе мішка, топ-топ. Стаміўся, сеў, адпачыў, зноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пайшоў, топ-топ. Ой, спаць хачу. Лёг Мішка спаць. Спіць, бай-бай. Спіць Мішка». У час такіх сюжэтных паказаў выхавальнік заахвочвае дзяцей да актыўных выказванняў.

Паглыбленымі заняткамі дзяцей другога года жыцця з'яуляецца гульня з лялькай. У методыцы распрацавана сістэма гульняў з лялькай: «Лялька спявае і танцуе», «Лялька Каця паказвае дзецям свае ўборы», «Катанне лялек на машынах», «Укладванне лялькі Ніны спаць», «Адзяванне лялькі пасля сну», «Гадаванне лялькі» і да т. п.[1] Лялька ўспрымаецца дзецьмі як жывая істота, і яны з задавальненнем размаўляюць з ею.

На першых занятках выхавальнік знаёміць малых з новай (дыдактычнай) лялькай. Дзеці сядзяць на крэселках, выхавальнік прыносіць ляльку, загорнутую ў коўдру, і лялечнае крэселка Разгортвае ляльку, пытаецца ў дзяцей: «Хто гэта?», па чарзе звяртаецца да кожнага дзіцяці: «Гэта Каця. Да нас у госці прыйшла Каця. Паглядзі, Каця, на дзетак. Гэта Вова, а гэта Валя». Лялька знаёміцца з дзецьмі. Выхавальнік звяртае ўвагу на тое, што ўсе дзеці сядзяць на крэселках. Прапануе сказаць: «Сядай, Каця, сядай». Садзіць ляльку на крэселка. Потым дзеці паказваюць і па магчымасці называюць нос, рот, вочы, рукі, ногі на ляльцы. У канцы заняткаў выхавальнік раздае дзецям маленькіх лялек і размаўляе з кожным дзіцем пра яго ляльку. Далей праводзяцца гульні з лялькай Кацяй, якія адлюстроўваюць разнастайныя дзеянні. Асноўная мэта такіх гульняў - замацаванне разумення маўлення і навучанне дзяцей размаўляць сказамі.

**Паказ інсцэніровак.** Сюжэтныя цацкі (лялькі, зайчыкі, мішкі) выступаюць дзеючымі асобамі інсцэніровак. Дарослы стварае своеасаблівыя дэкарацыі з цацак на стале (пакой лялкі, хатку, горку і да т. п.), расказвае і паказвае дзецям сцэнку, блізкую па змесце да жыццёвага вопыту. У метадычнай літаратуры апісаны некаторыя сюжэты інсцэніровак для дзяцей другога года жыцця: «Хто у хатцы жыве?», «Зборы на прагулку», «Наташа ў

[1] Дидактические игры и занятия з детьми раннего возраста / Под ред. Е.И.Радиной, М.И.Поповой. М., 1972.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гасцях у дзяцей», «Кошка Мурка», «Поўны двор», «Катанне з горкі», «Каруселі”[1]

Перад правядзеннем інсцэніровак трэба загадзя прадумаць, якія лёгкія словы, гукаперайманні, фразы можна выдзеліць для паўтарэння дзецьмі, як актывізаваць маўленне дзяцей у працэсе паказу сюжэтных сцэнак.

**Арганізаваныя назіранні.** Для паспяховага выканання праграмных задач па азнаямленні з наваколлем і развіцця маўлення дзяцей другога года жыцця праводзяцца арганізаваныя назіранні ў групавым пакоі, на пляцоўцы дзіцячага сада і за яго межамі[2]. Пачынаць назіранні трэба ў групавым пакоі Дзеці назіраюць за працай дарослых, за рыбкамі ў акварыуме, за кветкамі, раслінамі, знаёмяцца з назвамі навакольных прадметаў: мэблі, посуду, асабістых рэчаў, назвамі памяшканняў дзіцячага сада.

Напрыклад, назіранні за птушкай у клетцы. Клетку ставяць на віднае месца. Дарослы прапануе дзецям паглядзець на птушку, пытаецца: «Хто жыве ў клетцы? Што робіць птушка? Паглядзіце, дзеці, птушка паляцела, села на палачку, сядзіць і глядзіць на дзяцей. Зноў паляцела. Пакормім птушку». Дае птушцы ваду і зярняткі. Гаворыць: «Птушка дзяўбе: тук-тук-тук. Як дзяўбе птушка? Птушка п'е ваду. Што робіць птушка? Птушка наелася, напілася і зноў паляцела. Лятае птушка. Давайце, дзеці, скажам птушцы: «Птушка, птушка, ляці да нас». Можна разам в дзецьмі заспяваць знаёмую песеньку пра птушку.

3 акна пакоя можна назіраць за вуліцай, рухам транспарту, прыроднымі з’явамі, пляцоўкай дзіцячага сада.

У летні перыяд пасля 1 года 4 месяцаў арганізоўваюцца назіранні на тэрыторыі дзіцячага сада. Прыцягвае ўвагу дзяцей праца дарослых, расліны, птушкі. За межамі дзіцячага сада наладжваюцца назіранні за транспартам, некаторымі свойскімі жывёламі (кошкай, сабакам, пеўнікам)

---

[1] Петрова В.А. Занятия по развитию речи с детьми до трех лет. М., 1970. С. 73-74.

[2] Дидактические игры и занятия с детьми раннего возраста / Под ред. С.Л.Новоселовой. М., 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гульні на гукаперайманне. З дзецьмі другога года жыцця праводзяцца простыя гульні на гукаперайманне: “Гусі-гусі”, «Хто як крычыць?», «Аўтамабілі» і інш.. У ходзе такіх гульняў дзеці пераймаюць гукі і словы за выхавальнікам. Напрыклад, гульня «Гусі-rусі». Выхавальнік бярэ дзве цацачныя гусі, хавае іх пад стол і прапануе дзецям паклікаць гусей: «Гусі-гусі! Гусі-гусі!» Выстаўляе цацкі на стол і прагаворвае: «Га-га-га!» — «Есці хочаце?» — «Ага!» Затым прапануе дзецям усім разам паклікаць гусей: «Гусі-гусі! Гусі-гусі!», раздае цацкі кожнаму дзіцяці. Дзеці гуляюць з цацкамі і вымаўляюць: «Га-га-га», «Ага». У гульні «Аўтамабілі» дзеці спачатку разглядваюць цацачную машыну, называюць яе, вымаўляюць гукапераймальнае слова «бі-бі», пасля чаго выхавальнік раздае дзецям машынкі, з якімі ўсе дзеці гуляюць, вымаўляючы «бі-бі».

**Чытанне дзецям вершаў, пацешак, казак.** З ранняга ўзросту дзеці чуюць ад дарослых калыханкі, песенькі, пацешкі Гэта дае ім магчымасць успрымаць родную мову на узроўні мастацтва. На другім годзе жыцця з дзецьмі праводзяцца і заняткі па чытанні даступных ім мастацкіх твораў. Гэта перш за ўсё творы вуснай народнай творчасці («Ладкі-ладачкі», Сарока-варона», «Кую, кую ножку», «Ішла каза», “А курачка-рабачка», «Не хадзі, коцік» і інш.), творы беларускіх паэтаў («Бычок», «Мячык» С. Сокалава-Воюша, «Коцік», «Кукарэку, певунок» Н. Галіноўскай, «Чыкі-чыкі, сарока» Ул. Луцэвіч і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мастацкія творы для дзяцей гэтага ўзросту вызначаюцца дынамізмам развіцця падзей, сюжэтнасцю, мова іх мілагучная, пявучая, лексіка падабрана так, што ў словах мала цяжкіх гукаў, большасць твораў пабудавана на дыялозе. Адны і тыя ж вершы, пацешеі чытаюць дзецям некалькі разоў (2—3 заняткі).

Напрыклад, азнаямленне дзяцей ад 1 года да 1 года 6 месяцаў з пацешкай «Зязюля». Перад дзецьмі то з'яўляецца, то знікае цацачная птушка З'яўленне яе выхавальнік суправаджае гукаперайманнем «ку-ку». Тлумачыць: «Гэта птушка - зязюдя, яна кукуе «ку-ку». Птушка сядае аднаму дзіцяці на ручку,

другому - на  галоўку, трэцяму ножку і г. д. Кожны раз паўтараецца гукаперайманне "ку-ку». Затым, трымаючы птушку ў руках, выхавальнік павольна прагаворвае пацешку (2—3 разы):

Зязюлька, зязюлька
У зялёным лясочку
Кліча на дубочку:
«Ку-ку, ку-ку, ку-ку».

Пытаецца ў дзяцей, як кліча зязюля. Заахвочвае да вымаўлення гукаперaймання «ку-ку».

Другія заняткі праводзяцца, як папярэднія. На трэціх зноў прапануецца малым паслухаць пацешку пра птушку. Тэкст чытаецца павольна 2-3 разы, дзеці паўтараюць услед гукапераймальныя слова «ку-ку». Затым выхавальнік раздаве дзецям цацчных птушак, каб яны іх разгледзелі, пагулялм з імі, паразмаўлялі. Дзеці гуляюць з птушкамі, вымаўляючы «ку-ку». Выхавальнік хваліць кожнага з іх.

**Заняткі з малюнкамі**. Гэты від заняткаў мае сваю спецыфіку ў залежнасці ад узросту дзяцей.

На занятках з дзецьмі да 1 года 3-6 месяцаў спачатку ставіцца задача вучыць малых пазнаваць на малюнках знаёмыя прадметы незалежна ад іх знешняга выгляду, фарміраваць абагульненні, выклікаць перайманне гукаў. Дзецям паказваюцца малюнкі знаёмых прадметаў, але ў новым афармленні: іншага колеру, памеру, з іншага матэрыялу. Малюнак паказваецца ў пачатку заняткаў, даецца дзецям магчымасць разгледзець малюнак і пазнаць прадмет. Ставяцца пытанні. «Што гэта?» або «Хто гэта?» Паўтараецца адказ дзіцяці: «Так, гэта ляля». Выхавальніца хавае малюнак і зноў паказвае, суправаджаючы словамі: «Няма лялі", «Дзе ляля?», «Вось ляля», «Пакажы лялю». Методыка заняткаў у асноўным застаецца такой жа, як на першым годзе жыцця. Неабходна заахвочваць дзяцей да паўтарэння гукапераймальных слоў: «Скажы: кіса, мяу-мяу». Далей, паказваючы другі і трэці малюнкі, выхавальнік пытаецца ў дзяцей: «Хто гэта?», «Што гэта?»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі дзіця маўчыць, даецца адказ: «Гэта гуска, га-га-га. Скажы: га-га-га». Паказ і называние малюнкаў суправаджаецца разнастайнымі дзеяннямі з імі[1]: «Пакладзі», «Вазьмі», «Прынясі», «Пакажы ўсім дзецям», «Схавай» і да т. п. На адных занятках можна выкарыстоўваць 6-8 малюнкаў, напрыклад, знаёмыя малюнкі мячык, лялька, сабачка, машына; новыя малюнкі: дудачка, гусь, пеўнік, гадзіннік.

Неабходна ўводзіць малюнкі з выявай прадметаў у дзеянні, напрыклад дзяучынка сядзіць, есць, бяжыць, спіць, упала. Паказваючы малюнкі, выхавальнік ужывае кароткія сказы: «Ляля спіць», «Сабачка есць», «Коцік бяжыць». З мэтай фарміравання абагульненняў лепш паказваць адзін за адным малюнкі, на якіх адлюстраваны прадметы ў адных і тых жа дзеяннях (сабачка спіць і коцік спіць) і адзін прадмет у розных дзеяннях (дзяўчынка сядзіць і дзяўчынка спіць). Ускладняюцца і пытанні: «Што робіць сабачка?», «Што робіць дзяўчынка?»

У гэтым узросце дзяцей трэба вучыць гаварыць правільнымі, а не лёгкімі словамі. Калі дзіця гаворыць, напрыклад: «Кіса бай-бай», яго трэба выправіць: «Так, коцік спіць. Скажы: коцік спіць, бай».[

Пры разглядванні малюнкаў можна выкарыстоўваць простую мову, напрыклад прапанаваць дзіцяці сказаць: «Спі, спі, сабачка», «Еш, еш, Каця». Для развіцця назіральнасці і актыўнага маўлення можна выкарыстоўваць прадметныя малюнй з дэталямі: «Хлопчык на коніку», «Хлопчык з мячыкам», «Дзяўчынка з вядзерцам» або малюнкі з выявай лялькі з выразна выдзеленымі дэталямі адзення: кішэнь, гузікі, бант, шкарпэткі, чаравікі Дзеці разглядваюць малюнак, называюць і паказваюць дэталі.

З 1 года 6 месяцаў на занятках можна аб'ядноўваць да шасці чалавек. З дзецьмі праводзяцца заняткі з *прадметнымі* і *сюжэтнымі* малюнкамі (настольнымі і насценнымі карцінкамі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[1] Радина Е.И., Езикеева В.А. Методические указания к картинкам для расширения представлений и развития речи детей второго и третьего года жизни. М., 1983.

Заняткі з прадметнымі малюнкамі выкарыстоўваюцца для замацавання разумения велічыні, колеру, уласцівасцей прадметаў, іх назваў. 3 гэтай мэтай на адных занятках выкарыстоўваюцца парныя малюнкі: сабачка чорны і белы, вялікі і маленькі; сцяжок сіні і жоўты; яблык чырвоны і сцяжок чырвоны і г. д. Дзецям прапануецца паказаць і назваць вялікі і маленькі прадметы, жоўты, зялёны, чырвоны і г. д., расказаць змест[1] карцінкі.

Разглядваць сюжэтныя малюнкі неабходна спачатку за сталом з 3-4 дзецьмі. Сюжэт падбіраецца нескладаны: «Маці купае дзіця», «Хлопчык гуляе з сабакам». Выхавальнік паказвае дзецям малюнак і расказвае, прыцягваючы дзяцей да паказу і называния асобных прадметаў і дзеянняу, напрыклад заняткі з сюжэтным малюнкам «Дзеці абедаюць». Выхавальнік расказвае: «На карцінцы намаляваны дзеці. Яны абедаюць, сядзяць за сталом спакойна. Хлопчык (паказвае) есць кашу з талеркі Вася, пакажы талерку. А што гэта? (Вялікая лыжка.) А дзяўчынка ўжо з'ела кашу. Яна есць ягады з кампоту лыжачкай. А гэта што? (Кубачак.) Так, кампот у кубачку. А што гэта? (Сподачак.) Што робіць дзяўчынка? (Дзяўчынка есць ягадкі з кампоту). Гэты хлопчык ужо паеў. Ён выцірае рот сурвэткай. Што робіць хлопчык? Сурвэткі стаяць у шклянцы. Таня, пакажы шклянку з сурвэткамі Дзеці добра, акуратна ядуць. Сукенкі і кашулькі на іх чыстыя». Пасля дарослы просіць асобных дзяцей расказаць, што робяць хлопчык і дзяўчынка, што ў іх у руках, якога колеру адзенне.

У канцы другога года жыцця, з 1 года 9 месяцаў, можна выкарыстоўваць сюжэтныя карціны вялікага памеру (насценныя). Заняткі з такімі карцінамі праводзяцца з 10-12 дзецьмі. Карціна прымацоўваецца да дошцы, дзеці сядзяць паўкругам. Методыка правядзення заняткаў застаецца той жа, што і папярэдніх: выхавальнік расказвае сам і заахвочвае да расказвання дзяцей.

**Методыка развіцця маўлення дзяцей трэцяга года жыцця**

[1] Радина Е.И., Езикеева В.А. Методические указания к картинкам для расширения представлений и развития речи детей второго и третьего года жизни. М., 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэці год жыцця – пачатак маўленчых зносін дзяцей паміж сабой. З канца другога года жыцця маўленне шырока выкарстоўваецца для суправаджэння дзеянняў дзяцей, а ў канцы трэцяга года нават для планавання ўласнай дзейнасці: “Намалюю додзік” (намалюю дожджык). Актыўнае маўленне пранізвае ўсю дзейнасць дзіцяці і выконвае функцыі рэпрадукцыі, ўзнаўлення, таму па яго выказваннях можна судзіць аб узроўні разумення, успрымання, мыслення.

Задачы развіцця маўлення дзяцей на трэцім годзе жыцця рознастайныя. Неабходна прывучаць дзяцей разумець маўленне акружаючых людзей без нагляднага суправаджэння і выконваць слоўныя даручэнні дарослага; пашыраць актыўны слоўнік (к 3 гадам – да 1200-1500 слоў), папаўняючы яго рознастайнымі часцінамі мовы; фарміраваць граматычны лад маўлення, дамагаючыся, каб пасля 2 гадоў 6 месяцаў дзеці выкарыстоўвалі розныя віды сказаў; удасканальваць вымаўленне гукаў; развіваць гутарковае маўленне, уменне выразіць у слоўнай форме атрыманыя ўяўленні; развіваць маўленчыя зносіны з дарослымі і равеснікамі.

Для фарміравання маўлення важнае значэнне мае развіццё арыентыроўкі ў наваколлі. Трэба развіваць у дзяцей здольнасць назіраць, пазнаваць розныя прадметы, з’явы, а таксама знаёміць іх з працоўнымі дзеяннямі дарослых. У выніку будуць развівацца сэнсавы бок маўлення, артыкуляцыя, функцыі зносін і абагульнення.

Важна выхоўваць у дзяцей патрэбу карыстацца новым моўным матэрыялам, каб дзіця не толькі засвоіла тое ці іншае слова, але і навучылася ўжываць яго паводле свайго меркавання.

Формы развіцця маўлення застаюцца ранейшымі. Развіццё маўлення – разуменне і гаварэнне - адбываецца *ў штодзённым жыцці*: у рэжымныя моманты, у самастойнай гульні. Дзеці працягваюць знаёмяцца з элементарнымі прыкметамі (смак, колер, форма, памер) і прызначэннем прадметаў, якія найбольш часта ім сутсракаюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У размовах з дзецьмі трэба пазбягаць ужывання аднастайных слоў, выразаў, фраз. Напрыклад, замест звычайнай аднаслоўный фразы “горача”, можна сказаць: “Суп гарачы, трэба есці асярожна”, або: “Трошкі пачакай, суп гарачы, не апячыся”. Калі дарослы адны і тыя ж думкі выражае рознымі словамі, гэта не толькі ўзбагачае слоўнік дзяцей, але і паглыбляюць яго ўяўленні аб наваколлі. Дзіця пачынае параўноўваць, супастаўляць, шукаць тлумачэнні, што садзейнічае разівіццю мыслення.

Любое патрабаванне, указанне трэба растлумачыць: “Надзень рукавічкі, таму што холадна” Гэта прывучае дзіця матываваць свае просьбы, жаданні.

Развіццё разумення і актыўнага маўлення ажыццяўляецца таксама на *спецыяльных занятках* і на тых занятках, у ходзе якіх развіваюцца дзеянні з прадметамі, рухі і г.д. Наглядныя сродкі, што выкарыстоўваюцца на занятках, тыя ж, што і на папярэднім узроставым этапе, але змест заняткаў ускладняецца.

Пашыраюцца і паглыбляюцца **арганізаваныя назіранні** за наваколлем. Дзеці не толькі назіраюць за рознымі транспартнымі сродкамі, але і вучацца адрозніваць іх па знешнім выглядзе (трамваі, аўтобусы, тралейбусы, легкавыя і грузавыя машыны), паказваць, з якіх частак яны складаюцца (кабіна, руль, колы, дзверы).

У працэсе назіранняў за жывымі аб’ектамі удакладняюцца тыя ўяўленні аб іх, што ўжо маюцца ў дзяцей: малых знаёмяць з асаблівасцямі іх знешняга выгляду, з паводзінамі, расказваць, як і што тыя ядуць. Напрыклад, выхавальнік прапануе дзецям паглядзець на кошку і расксвае пра яе: у кошкі поўць мяккая і пушыстая. Хвост вялікі і таксама пушысты. Кошка ходзіць, можа бегаць, скакаць. У яе на лапках ёсць мяккія падушачкі і вострыя когці. Кошка ходзіць ціхенька, нячутна, таму што на лапах падушачкі. Кошка есць мяса, хлебча язычком малако.

На паўторных занятках з мэтай актывізацыі маўлення дзяцей выхавальнік задае пытанні тыпу: як мяўкае кошка? Які хвост у кошкі? Як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ходзіць кошка? І да т.п. Педагог дапаўняе адказы дзяцей, пры неабходнасці сам рсказвае, пабуджаючы дзяцей паўтараць за ім.

Назіранні праводзяцца ў памяшканні і на вуліцы. У працэсе іх трэба не толькі канстатаваць тое, што адбываецца (дворнік чысціць дарожкі ад снега шырокай лапатай, зграбае снег у гурбы), але і вучыць параўноўваць прадметы, устанаўляіваць паміж імі падабедства памідор чырвоны і морква чырвоная) і адрозненні (памідор круглы, .а морква доўгая; смак у іх розны - памідор кіславаты, яго ядуць з соллю, морквачка салодкая).

**На занятках з малюнкамі** ў залежнасці ад задач, якія ставіць выхавальнік, выкарыстоўваюцца прадметныя малюнкі, выявы прадметаў у дзеянні, сюжэтныя малюнкі. Педагог .накіроўвае ўвагу дзяцей на дэтальнае разглядванне адлюстравання, на выяўленнее прычынных сувязей.

Найбольш часта дзецям прад’яўляюцца сюжэтныя карцінкі. Яны могуць выкарыстоўвацца для для замацавання тых ўяўленняў і ведаў дзяцей, што былі атрыманы раней, а таксама для засваення новых. У адным выпадку выхавальнік спачатку падрабязна расказвае, што намалявана на карціне і ходу свайго расказа задае дзецям пытанні: “Глядзіце, дзеці, вось Таня. Яна корміць птушак. Што робіць Таня? Птушкі вялікія і маленькія. Якія птушкі?” І г.д. (Карціна “Таня і галубы” А.І.Салаўёвай.) У другім выпадку адлюстраванае на карціне можа служыць апорай для прыцягвання дзіцячага вопыту с наступным расказам выхавальніка. Дзецям паказваецца гэта ж карціна і даецца магчымасць выказацца. Затым выхавальнік задае пытанні: “Паглядзіце ў акно. Зараз зіма. На вуліцы снег. Вы хадзілі на прагулку? Бачылі птушак? Якія гэты былі птушкі? Дзе яны сядзелі? Вы кармілі іх?” І да т.п. Затым педагог прапануе свой расказ: “А цяпер паглядзіце на карціну. На гэтай карціне таксама зіма. Белы снег ляжыць на галінках дрэў, на дамах.. Таня цяпло апранулася: на ёй шуба, шапка валёнкі. Тут на дрэве сядзяць птушкі. І на даху дома сядзяць. А гэтыя птушкі дзяўбуць зярняткі”.

Праводзяцца **заняткі па мастацкай літаратуры**. Вялікае месца адводзіцца слуханню і наступнаму ўзнаўленню кароткіх расказаў, вершаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народных забаўлянак, песенак і інш. Адзін і той жа расказ паўтараецца некалькі разоў – як на адных занятках, так і праз інтэрвал у 2-3 дні. У далейшым расказ ускладняецца: даецца больш падрабязнае апісанне персанажаў, павялічваецца колькасць дзеянняў, якія імі выковаюцца, апісваецца месца дзеяння, ракрываюцца ўзаемаадносіны паміж персанажамі.

Дзеці вучаца ўважліва слухаць, разумець, а затым і пераказваць. Для гэтага неабходна арганізоўваць сумеснае расказванне: спачатку дзіця паўтарае за выхавальнікам словы і фразы, затым адказвае на пытанні педагога і ў рэшце рэшт расказвае самастойна.

Важнае значэнне мае чытанне кніг з ілюстрацыямі. Педагог прыцягвае ўвагу дзяцей да малюнка. і чытае або расказвае тэкст. У далейшым выхавальнік пабуджае дзяцей не толькі паглядзець малюнкі, але і расказаць пра тое, што напісана ў кнізе. Тут таксама наладжваецца сумесная дзейнасць дзіцяці і выхавальніка, які дапамагае малому пытаннямі, падказкамі.

На **занятках з цацкамі** разыгрываюцца якія-небудзь сюжэты (кармленне лялькі, жывёл, укладванне спаць, запрашэнне ў госці і да т.п.) Пад час такіх занятках даецца шмат назваў розных прадметаў, паказваюцца дзеянні з імі, раскрываецца іх прызначэнне. Па ходу дзеянняў неабходна прыцягваць дзяцей да актыўнага ўдзелу ва ўсім, што адбываецца (растаўляць посуд, апранаць ляльку, паставіць сподачак для кошкі).

Як і раней, вялікі ўплыў на развіццё маўлення аказваюць заняткі, на якіх выхоўваецца ўменне дзейнічаць з прадметамі і развіваецца рухальная актыўнасць. Гэта заняткі па фізічнай культуры, музычныя, па выяўленчай дзейнасці і нш. Тут дзеці вучацца выконваць элементы розных відаў дзейнасці, для чаго патрэбна пэўнага сума ведаў, уменняў, уяўленняў, захаванне пэўных правіл. У выніку ў дзяцей назапашваецца слоўнік, засвойваецца граматычны лад маўлення.

Больш падрабязна методыка фарміравання маўленчых навыкаў у дзяцей трэцяга года жыцця разглядваецца ў раздзелах, прысвечаных розным задачам развіцця маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ